

Створаная ў пачатку XX ст. Нацыянальная бібліятэка Беларусі на працягу дзесяцігоддзяў паслядоўна выконвае місію захавальніцы дакументальнай спадчыны беларускага народа. Яе гісторыя неразрыўна звязана з гісторыяй нашай дзяржавы.

XXI стагоддзе азнаменавана ўзвядзеннем унікальнага будынка Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі. Свой пачатак гэты грандыёзны праект бярэ ў 90-ых гг. мінулага стагоддзя, але толькі Указ Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь А.Р. Лукашэнкі ад 7 сакавіка 2002 г. «Аб будаўніцтве новага будынка дзяржаўнай установы «Нацыянальная бібліятэка Беларусі» зрабіў яго ажыццяўленне рэальнасцю. Будынак НББ з'яўляецца сучасным грамадскім архітэктурна-тэхнічным комплексам. Пры яго праектаванні архітэктарамі былі выкарыстаны самыя прагрэсіўныя навуковыя дасягненні і адкрыцці.

Магчымасці новага будынка кардынальна змянілі асноўныя напрамкі дзейнасці Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі, стварылі новы вобраз галоўнай інтэлектуальнай скарбніцы краіны. Бібліятэка пашырыла сферу ўзаемадзеяння з грамадствам, павялічыла кола сацыяльнага партнёрства, набыла новы статус. На базе Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі створаны рэспубліканскі інфармацыйны і сацыякультурны цэнтр.

На сучасным этапе развіцця бібліятэка бачыць сваё прызначэнне як у збіранні і захаванні дакументаў, так і ў задавальненні на якасна новым узроўні універсальных інфармацыйных і сацыякультурных патрэбнасцей грамадзян. Яе дзейнасць накіравана на набыццё і захаванне разнастайных па форме, змесце і мэтавым прызначэнні дакументаў, на забеспячэнне доступу жыхароў Беларусі да нацыянальных і сусветных інфармацыйных рэсурсаў.

Бібліятэка, арыентуючыся на актыўны ўдзел у агульнанацыянальных і культурных працэсах, стала сістэмным элементам сацыякультурнай інфраструктуры рэспублікі. Яна займаецца адукацыйнай, развіваючай, творчай, забаўляльнай, аздараўленчай дзейнасцю і тым самым пераўтварылася ў своеасаблівы цэнтр сацыякультурнага жыцця Беларусі.

Галоўная бібліятэка краіны захоўвае багацці, створаныя лепшымі розумамі чалавецтва, праз культуру і адукацыю звязвае мінулае з сучасным. З'яўляючыся культурна-асветнай установай сусветнага маштабу, Нацыянальная бібліятэка забяспечвае шырокі доступ карыстальнікаў да інфармацыйных рэсурсаў, садзейнічае інтэграцыі Беларусі ў сусветную інфармацыйную і культурную прастору.

*Дырэктар Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі*
*доктар педагагічных навук,*
*прафесар Р.С. Матульскі*